

Нас чакае непазбежны надыход трэцяй прамысловай рэвалюцыі. Яе наступствы могуць быць у значнай ступені непрадказальныя, а таму нам трэба загадзя рыхтавацца да змен у глабальнай эканоміцы.

СТАР. 4



Ёсць пахаванні, важныя не толькі для адной сям'і, але і для ўсяго народа. Могілкі, што маюць гістарычную значнасць, вайсковыя пахаванні — вось тыя месцы, дзе памяць адна на ўсіх, толькі мае розныя адценні.

СТАР. 5



Два віцебскія фотамастакі робяць фотаздымкі так, як гэта было ў XIX—пачатку XX стагоддзя. Кожны здымак з'яўляецца ўнікальным. Работа над стварэннем адной фотакарткі можа доўжыцца да некалькіх тыдняў.

СТАР. 8


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЖНІЎНЯ 2012 г. АЎТОРАК № 160 (27275) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## УЛАДЗІМІР МАКЕЙ НАЗНАЧАНЫ МІНІСТРАМ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ БЕЛАРУСІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка вызваліў Сяргея Мартынава ад пасады міністра замежных спраў у сувязі з пераходам на іншую работу. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы назначыў міністрам замежных спраў Уладзіміра Макея, вызваліўшы яго ад пасады кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Адпаведныя ўказы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 20 жніўня.

## МІНЭКАНОМІКІ АДЗНАЧАЕ АКТЫВІЗАЦЫЮ МАЛОГА І СЯРЭДНЯГА БІЗНЭСУ

**Эксперты Мінэканомікі падлічылі, што за першае паўгоддзе сёлета колькасць суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва павялічылася на 11 тысяч 321 адзінку, або амаль на 4 працэнты.**

Усяго, паводле інфармацыі Міністэрства па падатках і зборах, па стане на 1 ліпеня ў падатковых органах зарэгістравана 393 496 суб'ектаў гаспадарання, з якіх 324 714 адносяцца да сектара малога і сярэдняга прадпрымальніцтва (індывідуальных прадпрымальнікаў — 227 031, мікраарганізацый — 84 600, малых арганізацый — 110 704, суб'ектаў сярэдняга прадпрымальніцтва — 2379).

Падобная тэндэнцыя пашырэння малога і сярэдняга бізнэсу назіраецца і на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў і на вёсцы. Зараз на гэтых тэрыторыях функцыянуе 107 111 суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## У БЕЛАРУСІ ПРОЙДЗЕ ПЕРШЫ РЭСПУБЛІКАНСКІ КОНКУРС «СЯМ'Я ГОДА»

**Першы рэспубліканскі конкурс «Сям'я года» пройдзе ў Мінску 30 лістапада гэтага года, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

Правядзенне такога конкурсу прадугледжана Нацыянальнай праграмай дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады. Яго арганізатарам выступае Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пры ўдзеле Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры, Міністэрства інфармацыі, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў. Падрыхтоўка рэспубліканскага конкурсу ажыццяўляецца пры падтрымцы грамадскіх аб'яднанняў і міжнародных арганізацый.

Мэта конкурсу — павышэнне ролі і прэстыжу сям'і як сацыяльнага інстытута грамадства. Сярод асноўных задач — захаванне духоўна-маральных каштоўнасцяў сям'і, папулярызацыя ў грамадстве ідэі адказнага бацькоўства, адукацыя і выхаванне дзяцей і моладзі ў сістэме традыцыйных сямейных каштоўнасцяў.

Конкурс складаецца з двух этапаў: першы — рэгіянальны (праходзіць у кожнай вобласці і ў Мінску), другі — рэспубліканскі (праводзіцца ў сталіцы).

Распараджэннем прэм'ер-міністра зацверджаны склад арганізацыйнага камітэта другога этапу рэспубліканскага конкурсу на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Анатолем Тозікам. Намеснікамі старшыні аргкамітэта з'яўляюцца міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна Шчоткіна і старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, сустаршыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Антаніна Морава. У склад аргкамітэта ўключаны прадстаўнікі Апарата Саўміна, міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, інфармацыі, культуры, адукацыі, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, парламента, прафсаюзаў, грамадскіх і міжнародных арганізацый, СМІ, а таксама вядомыя ў краіне дзеячы культуры і адукацыі.

Паводле слоў спецыялістаў, падрыхтаваны праект Плана мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні другога этапу рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года».


УП «Минский городской центр недвижимости» сообщает о внесении изменений

в извещение о проведении 3 сентября 2012 года открытого аукциона (с условиями) по продаже права заключения договоров аренды открытых площадок с покрытием для размещения объектов общественного питания и мелкорозничной торговли, функционирующих в весенне-осенний период (опубликовано в газете «Звязда» от 18.08.2012) вместо слов: «Задаток должен быть внесен до 16.00 16.07.2012» следует читать: «Задаток должен быть внесен до 17.30 30.08.2012».

**Телефон для справок 327 40 22.** Интернет: www.mgcn.by.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




Жыхарка Хмелева Надзея ШАБАЛА частуе ўнукаў свянцоным яблыкам.

# ХМЕЛЕЎСКІ СПАС — «ЗАКЛАД»

**АМАЛЬ 300 гадоў у вёсцы Хмелева Жабінкаўскага раёна жыве традыцыя адзначаць Спас. У гэты дзень у вёсцы каля царквы спрадвеку праводзіліся вялікія яблычныя кірмашы і асвячалася садавіна. Прычым свята Спаса атрымала тут нязвыклую назву — «заклад». Бо ў гэты дзень у 1725 годзе была закладзена прыходская царква ў гонар Хрыстовага Праабражэння. Ад гэтай слаўнай падзеі і доўжыцца не менш слаўная традыцыя.**

СТАР. 3

## АЛЕКСАНДРЫЯ Ў ЛІДАРАХ

Экіпаж камбайнера Віктара Мільто з ААТ «Александрыйскае» Шклоўскага раёна — лідар жніва ў Магілёўскай вобласці. З поспехам яго павіншаваў старшыня аблвыканкама Пётр Руднік: у нядзелю прыехаў на поле падзякаваць за працу і ўручыць перадавікам падарункі. Вадзіцель гэтай гаспадаркі Дзяніс Латыпаў перавёз ужо больш за 4 тысячы тон збожжа.

У Віктара Мільто сёлетняе жніво — юбілейнае, трыццатае па ліку. Механізатар лічыць, што добры намалот яго экіпажа абумоўлены вопытам працы, надзейнай тэхнікай, высокай ураджайнасцю і дапамогай калег.

На гэтым тыдні ў Магілёўскай вобласці мяркуецца завяршыць жніво. Паводле звестак на панядзелак, у рэгіёне ўбрана 87% пасяўных плошчаў, намалочана 1 мільён 137 тысяч тон збожжа (гэта больш за мінулагодні ўзровень) пры сярэдняй ураджайнасці ў 39 цэнтнераў з гектара.

**Ілона ІВАНОВА.**



## ДА ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ НОВЫХ СТАНЦЫЙ МЕТРО БУДУЦЬ ПРЫЦЯГВАЦЬ МІНЧАН

**АРГАНІЗАВАЦЬ суботнікі на аб'ектах даручыў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай ЛАДУЦЬКА на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме.**

У работах ужо задзейнічаны супрацоўнікі «Мінсктранса», КУП «Мінскі метрапалітэн», Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі. Плануецца падключыць навучэнцаў адукацыйных устаноў, працоўныя калектывы прадпрыемстваў горада, грамадскасць. «Неабходна распрацаваць графікі работ, забяспечыць працуючых сродкамі абароны і інвентаром», — сказаў старшыня Мінгарвыканкама, дадаўшы, што суботнікі павінны праводзіцца рэгулярна да ўводу ў эксплуатацыю новых станцый.

Як адзначыў начальнік КУП «Дырэкцыя па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна» Павел Царун, пробны пропуск цягніка па трох новых станцыях Маскоўскай (першай) лініі Мінскага метрапалітэна («Пятроўшчына», «Міхалова», «Грушаўка») плануецца ажыццявіць у верасні, затым спецыялістам трэба будзе наладзіць абсталяванне і сістэмы забеспячэння бяспекі.

«Будаўнічая гатоўнасць станцый «Пятроўшчына» і «Грушаўка» як па асноўных канструкцыях, так і па аддзелцы даволі высокая. Ёсць некаторае адставанне па станцыі «Міхалова», тут павялічана колькасць будаўнікоў», — сказаў Павел Царун.

На наступны год намечаны ўвод у эксплуатацыю станцыі «Малінаўка», на гэтыя мэты ў гарадскім бюджэце зарэзервавана Br575 млрд.

Падрыхтоўчыя работы па будаўніцтве новага ўчастка метро ад станцыі «Інстытут культуры» да станцыі «Пятроўшчына» пачаліся ў 2005 годзе. Яго працягласць складае 5,2 км. Участак уключае тры станцыі: «Грушаўка», «Міхалова» і «Пятроўшчына». Усе яны стануць прадаўжэннем Маскоўскай лініі метро ў бок Паўднёвага Захаду і размешчаны па праспекце Дзяржынскага: «Грушаўка» — на скрыжаванні з вуліцай Шчорса, «Міхалова» — з вуліцай Гурскага, «Пятроўшчына» — з вуліцай Голубева.

Сёння ў сталічнай падземцы функцыянуюць дзве лініі агульнай працягласцю больш за 33 км з 25 станцыямі. Маскоўская лінія — першая лінія Мінскага метрапалітэна, яе даўжыня — 12,2 км. Лінія перасякае Мінск з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад і амаль цалкам праходзіць пад галоўнай магістраллю горада — праспектам Незалежнасці. Аўтазаводская лінія — другая лінія метро, яе даўжыня — 18,1 км. Лінія перасякае сталіцу з паўднёвага ўсходу на захад.

Падрыхтоўку тэрыторый для будаўніцтва трэцяй лініі мінскага метро плануецца пачаць да канца 2012 года.

Падрыхтоўчы этап прадугледжвае добраўпарадкаванне будпляцовак, узвядзенне інжынернага корпуса, падвядзенне электраэнергіі да месца правядзення работ, набыццё механізаванага шчыта — спецыяльнага праходчага комплексу для пракладкі тунэля. Акрамя таго, неабходна завяршыць перасяленне грамадзян з дамоў, якія падлягаюць зносу.

Трэцяя лінія Мінскага метрапалітэна злучыць паўднёвыя і паўночныя жылыя масівы горада з цэнтрам. Першы ўчастак трэцяй лініі, які складаецца з чатырох станцый, плануецца адкрыць у 2017 годзе.

**БЕЛТА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Барыс БАТУРА, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

***«Ва ўстановах адукацыі неабходны баланс у прымяненні найноўшых тэхналогій і фарміраванні здаровага ладу жыцця. Адукацыйныя тэхналогіі ўдасканальваюцца, значыць, мы вымушаны закупляць больш дарагое абсталяванне. Аднак пры гэтым ёсць небяспека стаць заложнікамі прагрэсу, таму ўсеагульную камп'ютарызацыю неабходна спалучаць з актыўнымі заняткамі спортам. Нядбайнае стаўленне да фізкультуры адгукнецца праблемамі са здароўем падрастаючага пакалення».***

## НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 23° |
| Віцебск | + 17° |
| Гомель | + 18° |
| Гродна | + 21° |
| Магілёў | + 17° |
| Мінск | + 17° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.08.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8310,00 | ■ |
| Еўра | 10270,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 259,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1026,08 | ▲ |

## АПОШНЯЕ ЦЯПЛО ЛЕТА?

**На гэтым тыдні надвор'е будзе даволі няўстойлівым, бо ў аўторак тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў скандынаўскага антыцыклону, які сфарміраваўся ў прахалоднай паветранай масе. Разам з тым, на паўднёвым захадзе працягне гаспадарыць малярухомы атмасферны фронт, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У большасці раёнаў сёння пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях чакаюцца дажджы, у асобных раёнах — з навальніцамі. Тэмпература — 16—22, па паўднёвым захадзе да 23—26 градусаў. А вось з серады атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе ўначы ў паўднёва-заходнія раёны, а ўдзень ужо і ў цэнтральны рэгіён Беларусі дажджы, месцамі з навальніцамі. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы 4—11 градусаў, удзень — 18—25; у заходніх раёнах цяплей: уначы — 12—17, удзень 26—29 цяпла.

Істотна не зменіцца надвор'е і ў чацвер. Уначы амаль паўсюдна, а ўдзень месцамі кароткачасовыя дажджы. Тэмпература ўначы 10—17 цяпла, удзень — ад 18 градусаў па поўначы да плюс 27 па поўдні краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВА УКРАІНЕ ПРАПАНАВАЛІ АДМОВІЦЦА АД БЮЛЕТЭНЯЎ НА РУСКАЙ МОВЕ

Аўтары ўкраінскага закона аб моўнай палітыцы, які забяспечыў недзяржаўным мовам (у тым ліку рускай) на тэрыторыі краіны афіцыйны статус, прапанавалі ўнесці ў яго шэраг паправак. У прыватнасці, яны маюць намер выключыць з закона палажэнне, якое дазваляе друкаваць выбарчыя бюлетэні на недзяржаўных мовах.

### НЕМЦАЎ МОГУЦЬ ШТРАФАВАЦЬ ЗА ШКОЛЬНЫЯ ПРАГУЛЫ ІХ ДЗЯЦЕЙ

Міністр працы Урсула фон дэр Ляен прапанавала штрафаваць бацькоў за школьныя прагулы іх дзяцей. Пра гэта міністр заявіла ў інтэрв'ю Berliner Morgenpost. На яе думку, пропуск урокаў у школе — гэта першы крок да беспрацоўя. Паводле статыстычных даследаванняў, у Германіі палова беспрацоўных не мае сярэдняй адукацыі. Паводле ацэнак Нямецкага саюза настаўнікаў, з прыблізна 11,4 мільёна школьнікаў у ФРГ 200.000 рэгулярна прапускаюць урокі без уважлівай прычыны. Ідэю міністра падтрымаў кіраўнік нямецкага паліцэйскага прафсаюза Райнер Вент. Ён адзначыў, што з прагулаў пачынаецца моладзевая злачыннасць.

### АМЕРЫКАНЦЫ ВЫВЕЛІ СПІС ПРАДУКТАЎ, ЯКІЯ ВЫКЛІКАЮЦЬ СТОМЛЕНАСЦЬ

Як паведамляе MedikForum, амерыканскія навукоўцы ў выніку сур'ёзнага даследавання прыйшлі да высновы, што некаторыя папулярныя прадукты неспрыяльна адбіваюцца на працаздольнасці чалавека і правакуюць дрымотнасць. У топавы спіс прадуктаў, з-за якіх чалавек адчувае сябе стомленым і разбітым, трапілі прадукты, якія мы часта набываем у супермаркетах. На першым месцы аказалася спіртное, якое выклікае дрымотнасць. Затым ідуць прысмакі, якія змяняюць узровень глюкозы ў крыві і стамляюць. На трэцім месцы — мяса індычкі. Да хуткай стамляльнасці прыводзяць і мучныя вырабы, у тым ліку макарона з белай пшанічнай мукі. Таксама ў топ-ліст трапіла смажаная ежа. Арганізм марнуе на яе пераварванне занадта шмат часу, і яна ўздзейнічае раздражняльна на стрававальны тракт.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### АНАЛІТЫКІ І ФІНАНСІСТЫ ЧАКАЮЦЬ АДМОВЫ ГРЭЦЫІ АД ЕЎРА Ў САМЫ БЛІЖЭЙШЫ ЧАС



Італію, Іспанію, Грэцыю і Партугалію ў 2012—2013 гадах чакае эканамічная рэцэсія, паведамляе ў сваёй справаздачы міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Moody`s.

У сваіх прагнозах аналітыкі спасылаюцца на звесткі статыстычнага агенцтва Eurostat, якое 14 жніўня апублікавала справаздачу па ВУП еўразоны за II квартал 2012 года — за гэты час паказчык скараціўся на 0,2% у квартальным вылічэнні. Найбольш неспрыяльную дынаміку прадэманстравалі паўднёвыя краіны (Італія, Іспанія, Грэцыя і Партугалія). У прыватнасці, ВУП Грэцыі па выніках квартала скараціўся на 6,2% у параўнанні з леташнім перыядам.

Раней паведамлялася, што Грэцыі для пакрыцця бюджэтных расходаў на бліжэйшыя два гады спатрэбяцца не 11,5, а 14 мільярдаў еўра. Да гэтай высновы прыйшлі эксперты так званай «вялікай тройкі» — МВФ, ЕС і ЕЦБ. Цяпер еўрапейскія лідары шукаюць, якім чынам вылучыць Грэцыі дадатковыя грошы без фарміравання новага пакета дапамогі. Перспектыва перакладаць на рахунак Афін новыя сумы не выклікае энтузіязму ў ЕС. Так, міністр фінансаў Германіі назваў балканскую краіну «бяздоннай бочкай», кідаць грошы ў якую становіцца бессэнсоўным заняткам.

Ключавым словам пры развагах пра будучыню Грэцыі з'яўляецца Grexit — яе выхад з зоны еўра. У Грэцыі засталося ўсяго два тыдні, каб пераканаць крэдытораў, што эканамічныя рэформы, якія да гэтага часу на самой справе не праводзіліся, усё ж такі адбудуцца. Калі цяперашнія планы скарачэння бюджэтных выдаткаў на 14,5 млрд еўра за бліжэйшыя два гады будуць прызнаны нерэалістычнымі, то чарговы транш еўрапейскай фінансавай дапамогі Грэцыі зноў будзе затрыманы. Калі гэта здарыцца, Грэцыя не зможа скончыць рэкапіталізацыю буйных банкаў. Без банкаўскіх крэдытаў эканоміка канчаткова абрынецца. Пенсіі і зарплаты работнікам дзяржсектара перастануць выплачвацца. Так званы Grexit здарыцца на працягу некалькіх тыдняў.

## КАРАТКА

Аб'ём замежных інвестыцый у эканоміку Гродзенскай вобласці ў I паўгоддзі павялічыўся ў 3,9 раза. У студзені-чэрвені 2012 года ў рэальны сектар эканомікі Гродзеншчыны (акрамя банкаў) замежныя інвестары ўклалі $217 млн.

Асноўныя работы па рэканструкцыі гістарычнага цэнтра Мінска плануецца завяршыць у 2013 годзе. Акрамя праектаў забудоў ішла цяжкая, карпатлівая работа па рэканструкцыі і рэстаўрацыі асобных будынкаў і збудаванняў, аднаўленні страчанага аблічча гісторыка-культурнай спадчыны. Уведзена ў эксплуатацыю 70 аб'ектаў, у тым ліку чатыры ў 2012 годзе, яшчэ дзесяць будзе здадзена да снежня, пятнаццаць — у 2013 годзе.

У Беларусі на 1 студзеня 2012 года зарэгістравана больш за 1 млн 650 зямельных участкаў, гэта на 9 працэнтаў больш, чым іх было па выніках 2010 года. Арганізаваная ў рэспубліцы зладжаная і сістэмная работа па рэгістрацыі нерухомай маёмасці дае магчымасць Беларусі мець высокі рэйтынг Сусветнага банка і Міжнароднай фінансавай карпарацыі.

Установы прафтэхадукацыі Мінска ўкамплектаваны навучэнцамі на 84 працэнты. Больш за 40 працэнтаў ад планавых лічбаў прыёму прыпадае на падрыхтоўку кадраў для будаўнічай галіны.

## ХУТКА СКОНЧЫЦЦА ЛЕТА. ПАДЗЯЛІЦЕСЯ, КАЛІ ЛАСКА, САМЫМІ ЯСКРАВЫМІ ЛЕТНІМІ ЎРАЖАННЯМІ



**Алена АЛЬХІМОВІЧ, адміністратар рынку:**

— Самае яскравае ўражанне — ад наведвання Чэхіі. Марыла пабываць там апошнія пяць гадоў. Вельмі прыгожая краіна, людзі прыветлівыя. І да беларусаў у чэхаў проста цудоўнае стаўленне. Мы з імі чымсьці падобныя. У іх, як і ў нас, цыбуля каля хатак пасаджана, зяляніна, што вельмі кранула. У Польшчы такога няма. Толькі вось лясоў я не ўбачыла... Затое піва таннейшае, чым вада.



**Валерый ІЛЬНЧЫК, слесар кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі:**

— Правёў выхадныя з сям'ёй на беразе возера каля горада Сянно, куды прыехалі на сваіх аўтамабілях — з палаткамі, лодкамі. Лавілі рыбу, варылі юшку, сядзелі каля вогнішча. Шыкоўна правялі час!



**Наталля АМОСАВА, настаўніца беларускай мовы:**

— Самае яскравае ўражанне — ад паездкі ў Крым, у сяло Мікалаеўка. Мора, пясок і... вельмі шмат беларусаў... Кавуны, дыні, персікі, дарэчы, па кошце такія ж, як у нас. Трапілі пад прыцэл кінакамеры і ўбачылі сябе па мясцовым тэлебачанні. Там якраз праходзіў «паказальны» працэс над мясцовым чыноўнікам: грошы на добраўпарадкаванне населенага пункта ён асвоіў у «патрэбным для яго месцы». Насамрэч, атэлі будуюцца шыкоўныя, а за агароджамі — развалы...

**Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# ЗЯМЕЛЬНЫ ПАДАТАК ГРАМАДЗЯНІН ПАВІНЕН ПЛАЦІЦЬ, ПА ПАДАТКУ НА НЕРУХОМАСЦЬ У ЯГО ЛЬГОТА

**У рэдакцыю патэлефанаваў жыхар вёскі Русаўшчына Клецкага раёна Віктар Іосіфавіч Чывель. Папрасіў дапамагчы разабрацца ў сітуацыі з падаткамі. У прыватнасці, заяўніка цікавіла, чаму яму налічваюць падатак на нерухомасць і на зямлю. Калі гаварыць пра першы, дык Віктар Іосіфавіч хаця зараз і на пенсіі, але ж пайшоў на заслужаны адпачынак з сельскагаспадарчага прадпрыемства, якое выпрацоўвала сельгаспрадукцыю. А значыць, як і іншыя аднавяскоўцы павінен мець ільготу па аплаце падатку на нерухомасць. Да таго ж заяўнік — інвалід другой групы, таму, як разважаў мужчына, ён павінен мець прэферэнцыю і па аплаце зямельнага падатку...**

Каб даць нашаму даўняму чытачу падрабязны адказ, мы звязаліся са спецыялістамі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па Клецкім раёне. Вось што нам паведаміў старшы дзяржаўны падатковы інспектар аддзела падаткаабкладання індывідуальных прадпрымальнікаў і фізічных асоб Аляксандр Горбач.

— У адпаведнасці з артыкулам 192 Асаблівай часткі Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь, грамадзяніну Чывелю Віктару Іосіфавічу налічаны зямельны падатак за 2012 год. У адпаведнасці з падпунктам 1.25 пункта 1 артыкула 194 Асаблівай часткі Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь, вызваляюцца ад падаткаабкладання зямельныя ўчасткі, прадастаўленыя фізічным асобам, што з'яўляюцца пенсіянерамі па ўзросце, інвалідам першай і другой групы і іншым непрацаздольным фізічным асобам пры адсутнасці рэгістрацыі па месцы іх жыхарства працаздольных асоб. Грамадзянін з'яўляецца пенсіянерам па ўзросце, інвалідам другой групы, аднак у яго доме зарэгістравана працаздольная дачка, якая пражывае ў Мінску. Адпаведна Чывель Віктар Іосіфавіч з'яўляецца плацельшчыкам зямельнага падатку, — распавёў Аляксандр Аляксандравіч.

Што датычыцца пытання пра падатак на нерухомасць... Ён за сёлетні год заяўніку не налічваўся ў адпаведнасці з падпунктам 1.19 пункта 1 артыкула 186 Асаблівай часткі Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Там сказана: будынкі і збудаванні, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці і належаць фізічным асобам, што пастаянна пражываюць у сельскай мясцовасці і працуюць у арганізацыях, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці і вядуць сельскагаспадарчую вытворчасць, а таксама колішнія работнікі такіх арганізацый, з якімі працоўны дагавор спынены ў сувязі з выхадам на пенсію. Грамадзянін Чывель Віктар Іосіфавіч пастаянна пражывае ў сельскай мясцовасці і выйшаў на пенсію з арганізацыі, якая вядзе сельскагаспадарчую вытворчасць.

Такія тлумачэнні былі дадзены работнікамі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Клецкім раёне не толькі для рэдакцыі, але і самому заяўніку. Пасля Віктар Іосіфавіч патэлефанаваў у «Звязду» яшчэ раз са словамі ўдзячнасці: маўляў, усе пытанні зняты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Жыхаркі вёскі Ірына Наўменка і Вацлава Мандра чакаюць удзельнікаў спасаўскага свята.



Урачыстае асвячэнне садавіны каля старажытнага хмелеўскага храма.

# ХМЕЛЕЎСКІ СПАС — «ЗАКЛАД»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нягледзячы на тое, што кірмашовыя звычаі ў Хмелеве, якія аб'ядноўвалі мясцовае насельніцтва, цягам часу адышлі ў нябыт, святкаванне «закладу» ніякім абставінам «перамагчы» нельга. Нават у часы вайны і атэістычнага росквіту не перарывалася традыцыя збірацца ў вёсцы ў гэты дзень. Нібы ў адзін голас хмелеўцы кажуць, што гэта — лепшае іх свята і яны заўсёды будуць яго шанаваць: дзе б і як бы далёка яны ні жылі, абавязкова прыедуць на свята на малую радзіму.

А ў гэты дзень, зранку наведаўшы храм (дарэчы, унікальны помнік драўлянага дойлідства Беларусі) з цудатворным абразом Маці Божай Чанстахоўскай (яе старажытнай копіяй), памаліўшыся і асвяціўшы садавіну — яблыкі, грушы, вінаград, хмелеўцы спяшаюцца ладзіць святочныя сталы. Сапраўды, у гэты дзень прынята збірацца за адным сталом усёй раднёй, запрашаць суседзяў і сяброў. Кожны выхадзец з вёскі з матуліным малаком узгадоўваецца з пашанай да «закладу», і ў гэты дзень абавязкова прыедзе сюды.

Старэйшая жыхарка вёскі Надзея Шабала заўсёды разразае на скрылікі свянцоны яблык і раздае ўнукам і праўнукам. Гэтым разам у яе двары за сталом сабралася добрых два дзясяткі родных.

— Кушайце свянцоны яблыка, хай вам Бог дае здароўя, — жадае Надзея Сяргееўна, вітаючы сваіх доўгачаканых гасцей, — калі хочаце больш яблыкаў, то ідзіце ў сад і рвіце самі.

Хмелеўскія сады хоць і не ломяцца сёлета ад ураджаю, але вельмі багатыя. І калі спеўны гурт мясцовай самадзейнасці пайшоў па вёсцы запрашаць жыхароў на свята, іх часцей віталі шчодрымі хмелеўскімі стравамі і ласункамі ў садзе пад яблынямі. За гэткую гасціннасць аднавяскоўцаў дзяўчынкі і хлопчыкі фальклорнага гурта «Дараносіца» аддзякавалі пабытавымі танцамі, якіх яны ведаюць багата. А вядомы на Брэстчыне гурт «Хмелеўскія валацугі» спяваў сваё традыцыйнае:

*«Ой, на ставу, да на ставочку, на ставу,*
*Там плавало два казакі да на чову,*
*Выйшла дзяўчына гарно зыбрана по воду,*
*Тай назвала казачэнька да соколю...»*

Не ведаючы мясцовай гутарковай манеры, можна падумаць, што ў Хмелева размаўляюць па-ўкраінску. Але прыслухаўшыся, разумееш, што тут асаблівы каларыт, не параўнальны ні з якімі іншымі гаворкамі. Свая — хмелеўская мова. І яе, як і свой «заклад», хмелеўцы шануюць змалку. Шкада толькі, што насельніцтва вёскі штогод скарачаецца.



Хмелеўская ўраджэнка Лідзія Старыкевіч у дзень «закладу» не забывае наведаць могілкі родных.

Была тут некалі свая традыцыя класці на могілках яблыкі. Цяпер такое ўбачыш рэдка. Адны жыхары спасылаюцца на рэлігію: маўляў, не дазваляе яна гэтае паганства. І сапраўды, манахі, якія ўтварылі ў межах царквы манастыр, пераконваюць насельніцтва, што ранейшая традыцыйная культура «грашыць» язычніцтвам. Але гэткім чынам у вяскоўцаў адыходзіць і спрадвечная спасаўская традыцыя наведвання на Спас могілак — рэдкая ўжо для Беларусі. Спас — гэта той лепшы час, калі варта памянуць і тых, хто колісь першым распачаў гэты непаўторны хмелеўскі «заклад». А чым памянуць, як не традыцыйным, колісь кірмашовым спасаўскім яблычкам?

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

■ Трэба ведаць

## Першая дапамога пры ўкусе змяі павінна быць аказана на працягу 20—30 хвілін

**У выпадку ўкусу змяі вельмі важна эфектыўна аказаць першую дапамогу. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА распавёў намеснік галоўнага ўрача па медчасці гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска Ігар Грыгор'еў.**

«Як паказвае практыка, у жніўні, які з'яўляецца самым грыбным месяцам сезона, такія выпадкі непазбежныя», — сказаў Ігар Грыгор'еў.

У беларускім лесе можна сустрэць гадзюку звычайную, мядзянку і вужа. Змеі імкнуцца пазбягаць чалавека, але калі апошні неспадзявана патрывожыць іх, то можа падвергнуцца нападу. «Змяя кідаецца толькі на прадмет, які рухаецца, таму, убачыўшы яе, важна захоўваць спакой — замерці на месцы, не выстаўляць наперад рукі і не ўцякаць», — распавёў спецыяліст.

Калі ўкусу пазбегнуць усё ж не ўдалося, то вельмі важна аказаць першую дапамогу на працягу 20—30 хвілін. «Трэба адсмактаць яд з ранкі, затым варта апрацаваць гэтае месца антысептыкам і накласці на яе чыстую павязку. Абавязкова трэба абезрухоміць пашкоджаную частку цела і даць пацярпеламу шмат пітва. Пасля гэтага даставіць яго ў медустанову», — сказаў намеснік галоўурача.

Ён падкрэсліў, што нясвоечасовы зварот да доктара можа пагражаць здароўю і жыццю чалавека. Таксама прывесці да неабарачальных наступстваў могуць і памылкі пры аказанні першай медыцынскай дапамогі: «На месца ўкусу ні ў якім разе нельга накладваць жгут. Гэта парушыць кровазварот і прывядзе да некрозу. Таксама нельга рабіць на ацёкшай частцы цела надрэзы: яны пагражаюць заражэннем крыві, якое можа прывесці нават да ампутацыі канечнасці».

Кожны год ад укусаў змей церпяць каля 300 жыхароў краіны. Самымі небяспечнымі лічацца ўкусы ў шыю, галаву, буйныя сасуды.

**Кар. БЕЛТА**

## Сутыкнуліся два аўтобусы

**Учора ў сталіцы каля 8 гадзін раніцы на вуліцы Пляханава на прыпыначным пункце «Васняцова» сутыкнуліся два аўтобусы.**

— Адзін з аўтобусаў ішоў па маршруце №9, другі — па маршруце №56, — паведаміла старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Заводскага РУУС г. Мінска Настасся Забаўская. — На месца здарэння выязджалі супрацоўнікі ДАІ, а таксама брыгады хуткай медыцынскай дапамогі. Згодна з папярэднімі данымі, пацярпелі 16 чалавек. Па факце здарэння праводзіцца праверка, у прыватнасці, устанаўліваюцца прычыны аварыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Рэпартаж

# ГЛЕБ СУПРАЦЬ АБАРОНЫ

**Сёлетні чэмпіянат узбагаціўся яшчэ адным матчам, у прадчуванні якога балельшчыкі БАТЭ і «Гомеля» жылі апошнія месяцы. У 19-м туры айчыннага першынства Барысаў прымаў паядынак, дзеля якога трэба было не толькі загадзя замаўляць квіткі, але і прыехаць са сталіцы.**



Аляксандр Глеб ідзе наперад.

Барысаўскі вечар хаваў у прыцемках футбалістаў абедзвюх каманд. Каля трыбуны яны размаўлялі са знаёмымі ці проста чакалі, калі аўтобусы крануцца са сваіх месцаў. Для іх матч сапраўды стаў цяжкім, завяршыўся безгалявой нічыёй, але падарыў заўзятарам цудоўны паядынак. Так, галоў яны не заўважылі, але сталі сведкамі выдатнай гульні Аляксандра Глеба, упэўненых дзеянняў варатароў і арыгінальнай тактычнай задумы. Як адзначыў пасля гульні галоўны трэнер «Гомеля» Алег Кубараў, клуб згуляў супраць чэмпіёнаў па тым тактычным малюнку, які ў чэмпіянаце каманда выкарыстоўваць пакуль больш не збіраецца.



Фаны БАТЭ цудоўна падтрымлівалі любімую каманду.

Безумоўна, гэты матч чакалі не толькі з-за лідарства клубаў Ганчарэнкі і Кубарава ў першынстве. Усе добра памятаюць, якім рэзанансным стала спатканне ў Гомелі, дзе БАТЭ перамог гаспадароў, завочную трэнерскую дуэль, у якой вельмі шчыра выказаўся трэнер «Гомеля». У выніку дыскваліфікацыю тады атрымаў Алег Кубараў і імпульсіўны форвард гасцей Арцём Канцавы. Пра тую гісторыю ніхто не забыўся. Па вялікім рахунку, чакалі працягу. Аднак другой часткі гомельскага баевіка паглядзець не атрымалася. На полі ніхто брудна не штурхаўся, шмат жоўтых картак не атрымоўваў, а Алег Міхайлавіч хоць калісьці і абяцаў не ехаць у Барысаў, але паступіў разумна і заняў сваё месца на трэнерскай лаве.

— Час лечыць, — па-філасофску заўважыў на прэс-канферэнцыі Кубараў. — Расстаўлена ўсё па сваіх месцах. Таму ніякіх праблем наогул не бачу. Вырашыў — і прыехаў.

Матч прайшоў у мужчынскай барацьбе. І пасля фінальнага свістка было прыемна бачыць, як стомленыя футбалісты дзякуюць адзін аднаму за гульню. Адзінае, што накаліла прадматчавую атмасферу, — дык гэта рашэнне федэрацыі дыскваліфікаваць на адзін матч гульца «Гомеля» Ілью Алексіевіча. Нядаўна хлопец з-за траўмы не прыехаў на зборы. Гэта, зразумела, не спадабалася трэнерскаму штабу зборнай, аднак рашэнне пра дыскваліфікацыю хоць і заснавана на заканадаўстве, але па-чалавечы жудаснае. Хлопца проста пакінулі без жадання, магчымасці згуляць супраць БАТЭ! Вось і цікава, у якім настроі ён цяпер будзе гуляць за «маладзёжку»?

— Адчуванне, быццам Ілы спалохаліся, — здзіўляецца Мікалай Кашэўскі, капітан «Гомеля». — Няхай бы згуляў хлопец! Ён не заслугоўваў падобнага пакарання. Нашу гульню ён бы ўзмацніў, але вырашылі так, як вырашылі.

У выніку Алексіевіч назіраў з трыбуны, як востра спрабуе атакаваць БАТЭ, а яго таварышы ўпэўнена абараняюцца і як цудоўна, нетрывіяльна ў гэты вечар выглядаў Аляксандр Глеб. Відавочна, што б ні казалі крытыканы, гэта ўзмацненне, якое было неабходна камандзе. Ён хоць і не вызначыўся ў гэтым безгалявым паядынку, але паказаў класны футбол. З'яўленне Глеба перад заўзятарамі ўбачыў і вядомы расійскі футбаліст Вадзім Яўсееў, які прыехаў у Беларусь, каб паўдзельнічаць у турніры па пляжным футболе.

— Годная гульня, — коратка рэзюмуе Яўсееў, які ў мінулым годзе гуляў за жодзінскае «Тарпеда». — Як Глеб? Бачна, што яшчэ не хапае кандыцый. Але, калі фізічна ён будзе добра падрыхтаваны (а сёння Аляксандр і так быў на галаву мацнейшы за ўсіх), то стане вялікім памочнікам для БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў, куды барысаўчане, спадзяюся, трапяць. Вы павінны радавацца, што ў ваш чэмпіянат вярнуўся такі гулец.

— Цяжка перамагчы саперніка, які ўвесь матч дзейнічае ад абароны, — размаўляў з журналістамі ў фае старэйшы Глеб. — Калі б забілі, напэўна, проста бы разарвалі. Не атрымалася. Раскрыць абарону амаль было немагчыма.

Пасля нічыёй у барысаўчан 42 балы, і БАТЭ працягвае лідзіраваць у чэмпіянаце. У «Шахцёра» 38 ачкоў, а ў «Гомеля» — 32 і тры матчы ў запасе.

❑❑❑

Дарэчы, пра балельшчыкаў. Яны ў флагмана найноўшага айчыннага футбола таксама асаблівыя. Падтрымлівае мясцовую каманду і стары, і малады, б'юць у барабаны і арганізоўваюць пераклічку паміж трыбунамі. Вынаходлівыя спецыялісты клуба на месцы былой хакейнай пляцоўкі стварылі фан-зону, дзе дарослы можа і келіх піва выпіць, а малому зробяць якасны «мэйк-ап» у выглядзе эмблемы любімай каманды.

У гэты пятнічны вечар БАТЭ падтрымлівалі цудоўна. Праўда, папала ад балельшчыкаў і Алегу Кубараву, за майскія падзеі і выступленні. Усё гэта, у прынцыпе, дзіцячыя жарты, на якія сур'ёзны чалавек закрые вушы. Але, калі пачынае ліцца лаянка ў адрас суддзі, што чуў і на іншых стадыёнах, робіцца крыху ніякавата. Тым больш, калі ўдзельнічаюць у гэтым і падлеткі. Для многіх гасцей барысаўскі стадыён стаў тым месцам, дзе сем'ямі падтрымліваюць любімую каманду. Няхай так будзе надалей, але без славеснага вычварэнства. Лес не сякуць языкамі...

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота аўтара.**

*г. Барысаў*

■ Летні настрой

# АДКАЗНАСЦЬ, ПАМНОЖАНАЯ НА СТО

## Чатыры змены працуе аздараўленчы лагер «Чайка» Ляхавіцкага аддзела адукацыі

**У мінулую пятніцу «Чайка» жыла пад знакам дня гумару, складнікам якога стала касцюміраванае шоу. На ўездзе ў лагер, каля шлагбаума, усіх наведвальнікаў сустракалі Ілья Кузьміч і Ілья Сімановіч, пераапранутыя ў дзяўчат з кідкім макіяжам і бюстам «а-ля Верка Сярдзючка». І вельмі пацешна было назіраць, як хлопцы ў дзявочых строях выконвалі сур'ёзную справу дзяжурных па лагеры. Кожны атрад прыдумваў тады нейкую сваю сцэнку, каб рассмяшыць астатніх таварышаў.**



Змена пад кіраўніцтвам старшага выхавальніка Людмілы Саўчык носіць назву «Вялікае касмічнае падарожжа». «Кожны дзень, — тлумачыць Людміла Канстанцінаўна, — мы падарожнічаем па планетах новых ведаў і адкрыццяў. Так пабудавана праграма выхавання. Пры гэтым захоўваецца важная ўмова: дзецям павінна быць цікава. Штодня трэба нешта прыдумваць, нечым здзіўляць, вось як, напрыклад, на дзень гумару».

А папярэдняя змена называлася «Скарбы нацыі». Паводле слоў яе аўтара, старшага выхавальніка Вольгі Прыхач, дзецям вельмі падабаецца шукаць скарбы. Таму кожны дзень змены станавіўся няпростым шляхам да чарговага куфэрка, які ў старажытнасці «закапаў чараўнік». Спачатку трэба было знайсці і склеіць кавалкі старой карты, а потым па карце прыйсці да месца скарбонкі. Якая ж радасць апаноўвала, калі пад старой сасной раптам адкопвалі скрынку. Адна, напрыклад, аказалася куфрам дружбы. Там захоўваліся мудрыя выслоўі пра дружбу як найвялікшае багацце. Потым разважалі на гэтую тэму, дзяліліся думкамі. Сустракаліся і куфар прыроды, куфар талентаў.

За 18 дзён змены школьнікі павінны нечаму навучыцца, даведацца шмат новага, карыснага, гавораць дарослыя. На гэта і разлічаны праграмы выхавання. Летам зручней за ўсё пазнаваць свой край. Экскурсіі ў Мірскі замак, у Нясвіжскі палац Радзівілаў, здаецца, прынеслі задавальненне ўсім экскурсантам. І з гасцямі, якіх запрашалі ў свой лясны куток, гэтым разам шанцавала. «Айцец Уладзімір, мясцовы святар, — расказвае дырэктар лагера Надзея Патапчык, — правёў надзвычай пранікнёную гутарку пра міласэрнасць і спагаду, пра паважлівыя адносіны да старэйшых, асабліва да ўласных бацькоў. Бацюшку ўважліва слухалі, задавалі шмат пытанняў, што азначае: зачапіла за душу, не пакінула абыякавым». Супрацоўнікі райаддзела МНС не проста арганізавалі цікавыя конкурсы з прызамі, але далі вельмі многа жыццёва важнай інфармацыі на тэму асабістай бяспекі, а таксама правілаў паводзін у экстрэмальнай сітуацыі.

Для Надзеі Пятроўны цяперашняя змена — 52-я ў яе педагагічнай практыцы. За чатыры летнія змены ў «Чайцы» адпачываюць і праходзяць аздараўленне прыкладна 400 дзяцей Ляхавіцкага раёна. Летні аздараўленчы лагер у раёне адзін. Некалі ён належаў сістэме прафсаюзаў аграпрама. Але ўжо даўно перададзены райаддзелу адукацыі, які падбірае калектыў педагогаў і супрацоўнікаў ды забяспечвае работу ўстановы. «Чайка» размешчана ў лясным маляўнічым куточку. Побач — прыгожы штучны вадаём, дзе пасялілася лебядзіная сям'я. Увесь гэты вывадак штодня прыплывае фактычна на тэрыторыю лагера, каб падкарміцца. Птушак тут шчодра частуюць. Дарослыя лебедзі атрымалі мянушкі Гоша і Маргоша. А ў Надзеі Пятроўны смелы Гоша хлеб бярэ нават з рук. Хоць купацца ў гэтым сезоне забараніла санітарная служба, добра пасядзець на беражку, і працэс назірання за птушкамі прыносіць усім вялікае задавальненне.

Дзецям падабаецца «Чайка». Тут ёсць сталыя аматары адпачынку, яны прыязджаюць трэці, а то і пяты раз. На працягу навучальнага года некаторыя карыстальнікі «У Кантакце» пытаюцца ў Вольгі Мікалаеўны, калі якая змена, згодна з праграмай. Вольга Прыхач — таксама старшы выхавальнік са стажам. Таму і пішуць ёй лісты праз інтэрнэт былыя выхаванцы.

Каб было нецікава, наўрад ці хто імкнуўся б трапіць у «Чайку» зноў. Кожную змену адпачываюць дзеці з прыёмных сем'яў, з дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. Не адмаўляюць з пуцёўкамі і бацькам тых падлеткаў, якія стаяць на ўліку ў інспекцыях па справах непаўналетніх. Так што здараюцца складаныя змены, бываюць атрады, якім надаецца павышаная ўвага. Хто думае, што ў лагеры працаваць проста, той памыляецца... Нават калі ў атрадзе ўсе дзеці ўзорных бацькоў, бываюць розныя сітуацыі, абумоўленыя паводзінамі. 17-гадовыя падлеткі без бацькоў, якія лічаць сябе дарослымі, — чым не падстава для бяссонных начэй выхавальнікаў? Гэта павінны ўлічваць педагогі летняй аздараўленчай установы.

А для бацькоў адпачынак сына ці дачкі вельмі выгадны ў эканамічным сэнсе. Пры кошце пуцёўкі ад 1300000 да 1500000 рублёў для сям'і яна абыходзіцца адпаведна ў 130000-150000: астатняе аплачваюць дзяржава і прадпрыемства альбо арганізацыя, дзе бацькі працуюць. На ўтрыманне саміх карпусоў і няпростай лагернай гаспадаркі сродкі выдзяляе раённы бюджэт. Вясной аддзел адукацыі ладзіць выязныя суботнікі, на якіх памяшканні і тэрыторыя рыхтуюцца да новага сезона. Як лічыць Надзея Патапчык, адзіны дзіцячы лагер у раёне мясцовая ўлада падтрымлівае, скардзіцца было б грэх. Сёлета райвыканкам да пачатку першай змены падарыў дзіцячую горку, новы камп'ютар. Усё, што патрэбна для нармальнай работы, для выхаваўчага працэсу, у «Чайцы» ёсць.

Дзеці атрымліваюць пяціразовае харчаванне. Кухары аддзела адукацыі працуюць вахтавым метадам — па дзевяць дзён. Пра старшага кухара Ірыну Хмарук, якая завяршала апошнюю змену, водгукі былі самыя лепшыя. Што асабліва падкрэсліла Надзея Патапчык, Ірына Аляксандраўна не проста смачна гатуе, але да дзяцей падыход мае. У яе з'ядаюць усю порцыю, што асабліва важна для выхаванцаў малодшага ўзросту, якія з'ехалі ад мам. Сама Надзея Пятроўна, назва пасады якой нядаўна памянялася з начальніка лагера на дырэктара, крыху іранічна ставіцца да новай назвы. Хаця згаджаецца, што пэўная доля праўды тут ёсць. Як адміністратар, адказны за ўсю гаспадарку, за матэрыяльна-тэхнічнае становішча, яна працуе круглы год. А момант ісціны для ўстановы наступае з пачатку лета, калі сюды прыязджаюць школьнікі. Увесь складаны механізм гаспадаркі лагера павінен дакладна працаваць, калектыў быць адной камандай — і ўсё гэта задача кіраўніка. «Пяцьдзясят дзве змены адпрацавала... — гаворыць Надзея Пятроўна. — Дня не было, каб не прасіла заступніцтва Бога. Прашу, каб збярог, захаваў дзяцей жывымі, здаровымі, разумнымі. Уяўляеце, гэта ж такая адказнасць — сотня дзяцей у нас?!»

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *Ляхавіцкі раён*



# Ігуменскі тракт

№ 7 (7)

■ 100 славутых прозвішчаў Беларусі

# БУДНЫЯ

## Сымон Будны — выдатны вучоны-асветнік

**У беларускай гісторыі прозвішча *Будны* звязана з асобай вучонага-асветніка, гуманіста, рэфарматара, прапаведніка, публіцыста, друкара, філосафа, педагога, гісторыка, пераемніка культурна-асветніцкіх традыцый Францыска Скарыны — Сымона Буднага. Імя Буднага было шырока вядома ў Расіі, Польшчы, Германіі, Італіі, Швейцарыі, Галандыі, Англіі і іншых краінах Еўропы.**

Дакладнае месца нараджэння і гады жыцця Сымона Буднага невядомыя. Лічыцца, што ён жыў і дзейнічаў прыкладна ў 1530 — 1593 гадах. Скончыў факультэт вольных мастацтваў Кракаўскага ўніверсітэта, вучыўся ў Пражскім універсітэце. Творчы шлях асветнік пачаў у Вільні, куды ў 1558 годзе пераехаў па запрашэнні віленскага ваяводы і канцлера Мікалая Радзівіла Чорнага. Тут, у сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, Будны выкладаў на беларускай мове катэхізіс у пратэстанцкай школе. Пазней, у 1560 годзе, Мікалай Радзівіл Чорны перавёў Буднага пастарам у саборную кальвінісцкую школу Клецка. Пры фінансавай падтрымцы беларускіх магнатаў Сымон Будны заснаваў у Нясвіжы адну з першых беларускіх друкарань, у якой у 1562 годзе выдаў на беларускай мове кнігі «Катэхізіс» і «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам». «Катэхізіс» Буднага выклікаў вялікую цікавасць у асяроддзі адукаваных людзей Еўропы. Новы перыяд у жыцці Буднага пачаўся ў Холхаве (1565-1566 гг.), дзе ён стаў адным з ідэйных правадыроў беларускай Рэфармацыі і ўзначаліў яе радыкальную плынь — антытрынітарызм. У Холхаве асветнік займаўся перакладам Бібліі і апокрыфаў. Асабліва плённым у творчасці Сымона Буднага стаў перыяд з 1573 да 1583 года, калі ён жыў у Лоску. Тут у 1574 годзе ў лоскай друкарні ўпершыню ў сусветнай літаратуры выйшаў Новы Запавет у перакладзе на польскую мову з прадмовай, каментарыямі і заўвагамі. Як справядліва адзначаюць даследчыкі, ніхто з тагачасных еўрапейскіх перакладчыкаў новазапаветных твораў не рабіў дагэтуль такой велізарнай тэксталагічнай працы, як Сымон Будны. Вучоныя прызнаюць, што дзякуючы фенаменальным аналітычным здольнасцям беларускага асветніка, яго таленту, шырокай эрудыцыі, дасканаламу веданню старажытных моў навукова-крытычны ўзровень выдання Новага Запавету 1574 г. быў самым высокім сярод усіх вядомых на той час у Еўропе. У Лоску вучоны надрукаваў свой галоўны тэалагічны трактат «Аб найгалоўнейшых палажэннях хрысціянскай веры». Будны напісаў каля 30 арыгінальных празаічных твораў і зрабіў вельмі многа перакладаў. Вучоны ведаў вялікую колькасць моў — старабеларускую, лацінскую, грэчаскую, італьянскую, польскую, чэшскую, рускую, іўрыт, стараславянскую і іншыя. Свае працы выдаваў, у асноўным, на трох мовах — беларускай, лацінскай і польскай. Творы Буднага мелі вялікую папулярнасць на Бацькаўшчыне: яго казанні з ахвотай слухалі жыхары Вільні, Клецка, Нясвіжа, Холхава, Заслаўя, Лоска, Любчы, Полацка, Вішнева. На вялікі жаль, многія кнігі, напісаныя і выдадзеныя Сымонам Будным, былі знішчаны і не дайшлі да нашага сучасніка, але ідэі, закладзеныя ў гэтых творах, аказалі вялікі ўплыў на развіццё тэалогіі, заканадаўства, беларускай літаратуры, мовы, філасофіі і гісторыі.

### Паходжанне прозвішча

Не існуе адзінай думкі адносна месцанараджэння і этнічнай прыналежнасці Сымона Буднага. Адны вучоныя мяркуюць, што Будны нарадзіўся ў Польшчы — у Мазовіі, у мястэчку Буда. Другія лічаць, што радзімай асветніка з'яўляецца Беларусь. Бясспрэчным застаецца тое, што прозвішча друкара паходзіць ад назвы населенага пункта Буда. Але сёння немагчыма вызначыць, з назвай якога канкрэтна населенага пункта — польскага або беларускага — звязана прозвішча асветніка. Паселішчы з такой назвай неаднаразова сустракаюцца ў Польшчы. Надзвычай многа такіх населеных пунктаў было ў старажытнасці на беларускіх землях. Звязана гэта было з тым, што ў перыяд з XV да сярэдзіны XIX стагоддзяў тут было шмат прадпрыемстваў — будаў, на якіх у спецыяльных печах выпальваўся дрэўны вугаль, гналася смала, дзёгаць. Звычайна такія прадпрыемствы размяшчаліся ў лясных масівах. Яны належалі буйным землеўладальнікам і лесапрамыслоўцам. *Будамі,* па сведчанні вучоных-анамастаў, называліся таксама лясныя пасёлкі, у якіх жылі буднікі — людзі, якія займаліся вытворчасцю вугалю, смалы і дзёгцю. У сувязі з шырокім распаўсюджаннем гэтага віду прамысловай дзейнасці ў Беларусі ўзнікла мноства паселішчаў, у аснову якіх пакладзена слова *буда*. Многія з гэтых назваў захаваліся да нашых дзён. Сустракаецца назва *Буда* і роднасныя з ёй у тапаніміі *Мінскай* (Валожынскі, Вілейскі, Дзяржынскі, Крупскі, Лагойскі, Мінскі, Слуцкі, Смалявіцкі, Старадарожскі, Барысаўскі раёны), *Магілёўскай* (Асіповіцкі, Бабруйскі, Бялыніцкі, Горацкі, Клімавіцкі, Хоцімскі раёны), *Брэсцкай* (Драгічынскі, Івацэвіцкі, Пінскі раёны), *Віцебскай* (Бешанковіцкі, Глыбоцкі, Верхнядзвінскі, Дубровенскі, Пастаўскі, Полацкі, Сенненскі, Ушацкі, Шумілінскі, Шаркаўшчынскі раёны), *Гродзенскай* (Гродзенскі, Навагрудскі раёны) абласцей. Найбольшая колькасць паселішчаў з асновай буда налічваецца на тэрыторыі *Гомельскай* вобласці (Акцябрскі, Буда-Кашалёўскі, Добрушскі, Жлобінскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Рагачоўскі, Рэчыцкі, Светлагорскі, Хойніцкі раёны).

### Будныя ў сучаснай Беларусі

